Источник: **«Мінская праўда» - 2012-07-17**

# Эксклюзіў для Еўропы

**Узорны фальклорны гурт “Берагіня” Мётчанскай адукацыйна-выхаваўчай установы Барысаўскага раёна стаў сімвалам вяртання да вытокаў. “Эксклюзівам у межах Еўропы” называюць яго беларускія навукоўцы. Такое ганаровае званне пацверджана не толькі вялікай працай па даследаванню традыцыйнай культуры свайго краю, але і ўдзелам “Берагіні” ў шматлікіх фестывалях фальклорнага мастацтва, у тым ліку міжнародных: “Intervolk” (Францыя), “Сожскі карагод” (Гомель), “Палескі карагод” (Пінск), “Барысаўскі прыстанак” (Барысаў).**



Мастацкі кіраўнік узорнага фальклорнага калектыву "Верабейкі" Любанскага раённага цэнтра культуры Сяргей Выскварка.



Фестываль заўсёды з усмешкай.




Удзельнікі фестывалю наведалі запаведныя мясціны Акцябрскага раёна.



У купальскім карагодзе ўсе ўдзельнікі фестывалю.



Фальклорны калектыў «Вясейка» Вясейскай школы мастацтваў
Слуцкага раёна.

Але найбольш цесна гісторыя мётчанскай “Берагіні” звязана з гісторыяй  “Берагіні” рудабельскай — так называецца рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва, які, пачынаючы з 1999 года, пастаянна ладзіцца ў маляўнічым куточку Усходняга Палесся — пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці, вядомым пад старой назвай Рудабелка.

— Усё пачалося 16 год назад, калі вядомы фалькларыст і этнахарэограф Мікалай Козенка вырашыў апрабаваць на базе нашай школы сваю праграму “Традыцыйная культура і дзеці”, — узгадвае Антаніна Абрамовіч, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Мётчанскай адукацыйна-выхаваўчай установы “Школа-сад”, фалькларыст. — Неаднойчы наведваліся да бабулі Аўгінні Грук, 1914 года нараджэння, у вёску Селішча, што за шэсць кіламетраў ад Мётчы. Яна спявала песні, расказвала нам казкі, вучыла нашых дзяцей таньчыць... Дзякуючы ёй нам удалося сабраць унікальны фальклорны матэрыял, які стаў асновай не толькі рэпертуару нашага калектыву, але і школьнага кнігазбору.

Мікалай Аляксеевіч прапанаваў навучаць дзяцей народнаму побытаваму танцу. У пачатковых класах праходзілі ўрокі рытмікі. Паралельна вялася работа па даследаванню традыцыйнай народнай культуры Мядоцкага краю. Займаліся гэтым і настаўнікі, і старшакласнікі.

Сёння ўсе тыя навыкі, якія атрымалі ад бабкі Аўгінні і іншых носьбітаў народнай культуры, дзеці дэманструюць на сцэне і ў жыцці. Лёгка, нязмушана, быццам гэтыя песні чулі з калыскі, карагоды вадзілі з дзяцінства. І галасы ж у мётчанскай дзятвы! Здаецца, толькі так і спяваюць народныя песні.

Тут хацелі аб’яднаць дзяцей і дарослых адной ідэяй, і Мікалай Аляксеевіч прапанаваў правесці мясцовы фестываль фальклорнага мастацтва. Фактычна тады, у 1996 годзе, і аформіўся наш калектыў “Берагіня”. А праз некалькі год мара Мікалая Козенкі — выхаванне дзяцей ва ўлонні традыцыйнай культуры — увасобілася ў цэлы фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня” ў Акцябрскім.

Вось і сёлета ў маляўнічы куток Усходняга Палесся з'ехалася больш за 900 беларускіх аматараў фальклорнага мастацтва, а таксама калектывы з Расіі і Украіны. Сёмы раз у раённым цэнтры — пасёлку Акцябрскі прайшоў рэспубліканскі фестываль фальклорнага

мастацтва «Берагіня».

**Крыніца беларускасці**
Фестываль праводзіцца раз у два гады. Але, па сутнасці, не спыняецца з 1998-га. Ад “Берагіні” да “Берагіні” праходзяць раённыя і абласныя адборачныя туры, навуковыя канферэнцыі і этнаграфічныя экспедыцыі, ствараюцца новыя творчыя калектывы. Многія з іх аб’ядноўваюць не адно і не два пакаленні аматараў фальклорнага мастацтва, а тры і нават чатыры.

Этнографы называюць “Берагіню” ўнікальным фестывалем, і яны маюць рацыю. Толькі тут, напэўна, можна пабачыць не сцэнічны, вядомы, бадай, кожнаму ў Беларусі варыянт той жа “Лявоніхі”, а безліч яе рэгіянальных варыянтаў.

— Такога фестывалю, як “Берагіня”, на еўрапейскім кантыненце больш няма, — адзначыла старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, член праўлення Саюза кампазітараў Беларусі кандыдат мастацтвазнаўства Тамара Варфаламеева. — Сёння часцей за ўсё выканаўцы вывучаюць народныя песні па нотах, а слухачы чуюць іх у аранжыроўцы, зробленай прафесійнымі кампазітарамі. У “Берагіні” — іншы падыход. Тут адбываецца вусная перадача традыцый народнай культуры ад старэйшага пакалення малодшаму. Моладзь, што ўдзельнічае ў фестывальных канцэртах, вывучае народную спадчыну на слых, на погляд, навобмацак... Выканаўцы не проста спяваюць старажытныя песні, узрост якіх вымяраецца стагоддзямі, яны спяваюць іх так, як пачулі ад 70—80-гадовых бабуль, якія атрымалі гэтыя песні ў спадчыну ад сваіх маці. “Берагіня” — гэта крыніца сапраўднай беларускасці на Беларусі. Тут няма падробак.

— Галоўны элемент фестывалю — элемент сапраўднасці, — распавядае Мікалай Козенка. — Таму на “Берагіні” заўсёды жывуць дзейства, святочны настрой, спантаннасць мастацкага самавыяўлення, жывуць святы — як гэта было ў народнай культуры. На фестывалі жыве адвечная песня, жывуць танец, карагод, творы  вуснай народнай прозы, скокі, гульні — асабліва абрадавыя і прымеркаваныя да абрадаў, якія характэрны для пэўнага рэгіёна Беларусі ці нават асобнай вёскі.

У святочным віры за чатыры фестывальныя дні ў Акцябрскім можна было ўбачыць бабуль у андараках, што вытканы і пашыты больш за стагоддзе таму, і моладзь, што стварыла свае строі ў нашы дні, але з улікам усіх тонкасцей старажытнай тэхналогіі і лакальных асаблівасцей аздаблення. Можна было пачуць, як гучалі старажытныя музычныя інструменты, што сёння выглядаюць экзотыкай, а некалі, стагоддзі таму, на іх ігралі амаль на любым сялянскім вяселлі. Даведацца, што ў беларускіх цымбалаў у параўнанні з рускімі, украінскімі, нямецкімі альбо кітайскімі найбольшая колькасць струн. А таксама паслухаць беларускую валынку.

— Валынка ў свядомасці сучаснага чалавека — сімвал Шатландыі, — кажа Мікалай Козенка. — Аказваецца, заўсёды бытавала яна і на Беларусі. Жалейка — самы беларускі музычны інструмент, а валынка — яе прамы нашчадак. У старажытнасці валынку выраблялі з жоўцевага пузыра быка. Гук у беларускай валынкі — нізкі і глыбокі. А гралі на гэтым старажытным інструменце падчас фестывалю зусім маладыя музыкі.

На Беларусі шмат танцаў, і ў кожным рэгіёне іх таньчаць па-свойму. Багата сустракаецца, напрыклад, “Коз”, якія выконваюцца і на вяселле, і на жніво, і на Каляды. У адным рэгіёне “Козы” ходзяць з “Жураўлямі”, у іншым — з “Мядзведзямі”. Нават “Лявоніху”, па якой пазнаюць Беларусь, у розных рэгіёнах таньчаць па-рознаму. Толькі ў Мётчы ёсць яе тры разнавіднасці — парная “Лявоніха”, “Лявоніха кальцом” і “Лявоніха кадрыльнага тыпу”.

Але акрамя разнавіднасцей аднаго і таго ж танца сустракаюцца на Беларусі характэрныя

толькі для нейкай адной мясцовасці. Напрыклад, “Рашатуха” — дзіўны танец-гульня ў Слуцкім раёне. Гэта пазаабрадавы танец, які выконвала жанчына. Ёй ставілі на галаву рэшата, спадніцу падымалі і завязвалі над галавой — такім чынам яна трымала рэшата. На пояс жанчыне завязвалі пінжак і ў яго рукавы ўстаўлялі палку. І вось такім чынам, нічога не бачачы, жанчына танцавала.

Аднак у цэнтры фестывальных падзей, вядома, былі конкурсныя выступленні. Удзельнікі форуму спаборнічалі адразу ў некалькіх відах і жанрах: харэаграфічнае мастацтва, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, песенная творчасць, інструментальнае майстэрства і шэраг намінацый. У ліку сёлетніх лаўрэатаў — вясейскі калектыў «Вясейка» са Случчыны. Быў адзначаны журы і гледачамі яшчэ адзін калектыў Мінскай вобласці — “Чабарок” Вілейскай гімназіі №2 .

**“Вясейка”-чарадзейка**

Фальклорны гурт “Вясейка” Вясейскай дзіцячай школы мастацтваў Слуцкага раёна — гэта 30 улюбёных у народныя песні і танцы хлопчыкаў і дзяўчынак. Ён створаны ў 1998 годзе. Кіруе калектывам Ніна Макоўская, працавіты і таленавіты педагог. Калектыў неаднойчы прымаў удзел у абласных фестывалях і конкурсах. Пасля выдатнага выступлення на фестывалі “Калыска талентаў” (Клецк) ім прапанавалі прыняць удзел у фестывалі “Берагіня”. “Вясейка” шмат рыхтавалася да гэтага фестывалю, які, па сутнасці, быў для яе сур’ёзным творчым выпрабаваннем. Журы фестывалю адзначыла высокі ўзровень музычнай падрыхтоўкі калектыву, тое, што юныя артысты валодаюць рознымі музычнымі інструментамі. А ў якіх касцюмах хлопчыкі і дзяўчынкі выйшлі на сцэну!..

— Конкурс шматгранны, патрэбна было ўмець і граць, і спяваць, і рабіць вырабы з саломкі, і вышываць, і ткаць. Таму рыхтавацца да “Берагіні” дапамагаў амаль увесь невялічкі калектыў дзіцячай школы мастацтваў, а гэта Ганна Дунаеўская, Святлана Расіч, Кацярына Крамарэнка, Алена Бартніцкая, — адзначыла Ніна Пятроўна.

Удзельнікі “Вясейкі” выдатна засвоілі ўрокі настаўнікаў. Ірына Пісарык не толькі добра грала на гармоніку, танцавала, але і прадэманстравала іншыя таленты, у прыватнасці, Іра была лепшая ў вышыванні сурвэткі. А Арцём Танко, партнёр Ірыны па танцу, выдатна сплёў пояс. Навыкі валодання рамёствамі бабуль і дзядуляў паказалі і іншыя члены калектыву: Яна Шутава вырабіла птушку з саломкі (прадэманстравала ігру на цымбалах), Хрысціна Чыгорская здзівіла журы падстаўкай пад посуд з травы. Добра грала на баяне Насця Барысевіч. Да фіналу па танцах дайшлі Уладзіслаў Трафімовіч і Дзіяна Пацала. Разам яны прадстаўлялі дэфіле нацыянальнага касцюма, характэрнага для Слуцкага раёна. Уладзіслаў быў адзначаны і ў намінацыі “Сольныя мужчынскія спевы”. А ў намінацыі “Мужчынскія спевы. Трыо” пакарылі дзявочыя сэрцы сваімі галасамі Уладзіслаў Трафімовіч, Арцём Танко і Даніла Беразоўскі.

Інакш кажучы, “Вясейка” — markdown рознабаковы таленавіты гурт. Вельмі прыемна, што яго першы выхад на сцэну “Берагіні” ўдаўся: ансамбль заняў другое месца ў турніры дзіцячых фальклорных калектываў і быў узнагароджаны ганаровым дыпломам ЮНЭСКА. Дома сустрэлі артыстаў цёпла, бурнымі авацыямі. На свяце вёскі ўсе ўдзельнікі “Вясейкі” атрымалі ад старшыні СВК “Вясейскі Пакроў” Людмілы Савановіч каштоўныя падарункі. А таксама атрымалі запрашэнне на міжнародны фестываль фальклору, які будзе праходзіць у жніўні ў Сербіі.

**Алёна ДРАЗДОЎСКАЯ.**